Сачыненне
Што такое адзінства

Шыкуць Васілій
Дзяржаўная ўстанова адукацыі
"Сярэдняя школа №20 г. Мінска імя Р. В. Булацкага"
5 клас

У сваім краі, як у раі. Гэта вядомая прыказка, якую я добра запомніў яшчэ ў пачатковай школе. Радзіма. Колькі сэнсу ў адным кароткім слове. Для кожнага чалавека гэтае слова азначае нешта сваё і нешта агульнае, больш значнае. Думаючы пра Радзіму, мы думаем пра тую вялікую, цудоўную краіну, у якой нарадзіліся.

Сапраўды, родная Беларусь – гэта не проста кропка на карце, гэта частка мяне, маіх думак і пачуццяў, гэта месца, дзе заўсёды адчуваю спакой. Беларусь – гэта зямля, дзе я нарадзіўся, дзе жывуць мае блізкія людзі і сябры.

Сям'я – гэта супольнасць, у якой мы выхоўваемся і знаёмімся з самымі важнымі ў жыцці рэчамі. Яднанне з блізкімі пачынаецца менавіта тут. У сям'і мяне вучаць любіць, падтрымліваць адзін аднаго і дзяліцца радасцямі і цяжкасцямі. Аднак я не абмяжоўваюся толькі сям'ёй. Сябры – гэта тыя, хто заўсёды побач, а сяброўства – тое, што нельга набыць у краме, тое, што трэба берагчы і шанаваць. Усе мы разам утвараем частку культуры, гісторыі і традыцый свайго народа. Яднанне з іншымі людзьмі, якія падзяляюць тую ж культуру, мову і каштоўнасці, стварае адчуванне адзінства.

Таму пытанне "Што такое адзінства?" для мяне не стала складаным. Яднанне, гармонія, мір, згода сям'я, сяброўства, гісторыя, традыцыі, каштоўнасці. Адзінства народа – гэта важнае і шматграннае паняцце, якое адлюстроўвае згуртаванасць людзей, якія жывуць на тэрыторыі Беларусі, і іх імкненне да агульных мэтаў і каштоўнасцяў. Гэта адзінства фарміруецца на аснове гістарычнага вопыту, духоўнай і культурнай спадчыны.

Такая важная тэма кожны дзень аказвае ўплыў на наша жыццё. Беларусь – гэта краіна з багатай гісторыяй і ўнікальнай культурай, а мы, беларусы, з'яўляемся адзіным народам.

Нельга забываць, што Беларусь перажыла шмат цяжкіх часоў, і беларусы заўсёды аб'ядноўваліся, каб супрацьстаяць цяжкасцям. Мы памятаем продкаў, якія змагаліся за нашу свабоду і незалежнасць. Гэта памяць аб'ядноўвае нас і нагадвае, што мы павінны падтрымліваць адзін аднаго.

Беларусаў яднае мова. Беларуская мова – гэта не проста спосаб зносін, гэта наша душа і ідэнтычнасць. Калі мы размаўляем на беларускай мове, мы адчуваем сувязь з нашымі продкамі і гісторыяй. Гэтая мова перадаецца з пакалення ў пакаленне, і кожны беларус, незалежна ад таго, дзе ён жыве, можа адчуць сябе часткай вялікай сям'і. І я – не выключэнне, бо таксама імкнуся размаўляць на беларускай мове.

Усе беларусы павінны ганарыцца сваёй культурай. З вялікім задавальненнем я чакаю лета, бо ўсёй сям'ёй мы святкуем Купалле. Для нас

гэта і адпачынак, і захаванне традыцый нашых продкаў, а таксама тое, што яшчэ больш дапамагае нам адчуваць яднанне.

Адзінства беларусаў можна ўбачыць у нашай гасціннасці і душэўнасці. Узаемадапамога і падтрымка – гэта тое, што робіць нас моцнымі.

Беларусы павінны быць патрыётамі – гэта значыць не толькі ганарыцца сваёй Радзімай, але і актыўна ўдзельнічаць у яе жыцці, дапамагаць ёй развівацца. Але патрыятызм таксама выяўляецца і ў самых дробных рэчах. Гэта можа быць просты жэст – дапамога суседу або удзел у акцыях дабрачыннасці. Як патрыёт, я імкнуся паважаць сваю Радзіму, быць актыўным і вучыць іншых любіць Беларусь. І мы можам рабіць гэта ўсе разам.

Захаванне традыцый і каштоўнасцей, гісторыі і культуры робіць нас лепшымі грамадзянамі краіны. Будучыня яе залежыць ад нашага адзінства, ад нашага патрыятызму ў маленькіх і вялікіх справах.

Адзінства народа – гэта складаная, але важная з’ява для любога грамадства. Яно заснавана на агульных мэтах, дазваляе пераадольваць цяжкасці і будаваць будучыню для ўсіх яго членаў. Стварэнне атмасферы даверу і ўзаемаразумення – гэта задача кожнага з нас, і толькі разам мы зможам дасягнуць сапраўднага адзінства. Я ганаруся, што з’яўляюся часткай нашай нацыянальнай справы.

Адзінства народа – гэта не толькі словы, гэта наша штодзённая праца. Мы павінны паважаць і захоўваць нашу адметнасць, каб заўсёды адчуваць сябе адзінай сям'ёй. Давайце будзем разам і падтрымліваць адзін аднаго, бо ў адзінстве – наша сіла!